ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 209 (1478) | АЎТОРАК, 8 верасьня 1931 г.

Ветка, 7. 17 МЮД веткаўская раённая організацыя комсамолу сустрэла чырвонымі абозамі: 48 тон збожжа, 12 тон гародніны, 10 тон фруктаў, 8—ільнанасеньня і 30 тон сена.

Вырасьлі на 300 чалавек, на 15 новых ячэяк. Партыі перадана 10 ч.

Абяцаем змагацца за шматмільённы комсамол, за соцыялістычную перабудову вёскі:

Райкамол

„Дактары прыходзяць констатаваць сьмерць"

Працоўныя Савецкай Беларусі пратэстуюць супроць зьдзекаў фашысцкіх катаў

Комсамольская організацыя папаўняе свае рады за лік рабочае моладзі

(З вопыту барацьбы КСМ Пінску)

У адзін прыгожы дзень каля 50 маладых рабочых а 10 гадзіне раніцы сабраліся для дэманстрацыі. Паказаліся чырвоныя сьцягі. З кожнай хвілінай шум уарастаў.

50 маладых адважных рабочых вялі за сабою масу больш 200 чал. З калён дэманстрантаў былі чутны лёзунгі: „Няхай жыве Міжнародны Юнацкі Дзень! Далоў эксплёатацыю! Далоў зьдзекі!" Раптам выскачыў паліцэйскі агент з наганам у руках. Ён меў намер спыніць дэманстрацыю. Але-ж колёны ня спыняюцца. Разьюшаны агент захоплівае двух маладых рабочых і выклікае сабе на дапамогу паліцэйскіх.

Рабочыя кідаюцца на паліцэйскага, каб вызваліць таварышоў. Завязваецца бойка. Маладыя рабочыя вызвалены. Адзін з агентаў паранены. На дапамогу агентам прыбывае конная паліцыя і адкрывае агонь па дэманстрантах. У выніку сутычкі паранены маладыя рабочы адвезены ў турэмны шпіталь.

У час сьвяткаваньня Кастрычнікавай рэвалюцыі многія партыйныя і комсамольскія актывістыя былі арыштаваны. У дэфэнзыве зьдзекваліся над арыштаванымі. Але-ж нічога ад іх не дабіліся. Застаўшаяся частка комуністых і комсамольцаў парашыла організаваць дэманстрацыю. Калёны дэманстрантаў праходзілі ля памяшканьня прокуратуры, былі выбіты ўсе шыбы. Арыштаў ніякіх ня было. У гэты час комсамольская організацыя папаўняла свае рады за лік рабочае моладзі.

Здрадніцкую ролю адыгрывае моладзь, якая знаходзіцца ў сіоніцкіх організацыях. Яна выкрыла дэфэнзыве члена гарадзкога камітэту Хану Красільшчык.

Пры вобыску ў яе хаце быў знойдзены чырвоны сьцяг і літаратура.

Ня гледзячы на ўсе зьдзекі і рэпрэсіі фашысцкага ўраду Польшчы, мы працягваем з яшчэ большай упартасьцю барацьбу за Савецкую Польшчу.

Гройшкіў

„Пойдзем дэманстраваць нашу беднасьць і жабрацтва"

Няма слоў, каб ахарактарызаваць жыцьцё працоўных у Польшчы. Словы: „дрэнна" і „жудасна"—ужо недастатковы. У гарадох, мястэчках, па вёсках бадзяюцца тысячы беспрацоўных і галодных. Іх думкі заняты адным, „а што будзе заўтра".

Замест таго, каб апісаць жыцьцё польскіх рабочых, я дам слова ім самім. Вось што пішуць беспрацоўныя з невялікага гарадка міністру працы.

„Наша беднасьць—бязьмежна, бо мы ўжо прадалі і вычарпалі ўсё, што было магчыма. Некалькі тысяч нас павінны са сваімі сем'ямі чакаць галоднай, жудаснай сьмерці. Наша акруга мае горы і на палёх шмат каменьня. Нават тыя, хто маюць некалькі гектараў зямлі, павінны купляць сабе хлеб. Што-ж казаць аб тых, хто ня мае нічога? Работы мы ня можам нідзе атрымаць. Мясцовы ўрад нічога ня робіць, каб палепшыць умовы жыцьця. Мы хочам працаваць і ў нас магла-бы быць работа: нашы шляхі, дарогі і масты патрабуюць рамонту. Але нам не даюць працы. Нам жудасна, калі плачуць дзеці, просячы маленькі кавалачак хлеба, і мы праклінаем свае жыцьцё, бо мы ня маем дапамогі.

За што прыгаварваеце вы, пане міністар, нашых дзяцей да галоднае сьмерці ў „вольнай", „незалежнай" краіне Польшчы?

Так далей існаваць нельга. Мы зьбярэм усіх жонак, дзяцей, знаёмых, усіх хто з намі, і пойдзем да ўраду патрабаваць працы і хлеба, пойдзем дэманстраваць нашу беднасьць і жабрацтва".

Гэта пішуць неорганізаваныя беспрацоўныя з глухога кутка Польшчы. Наіўныя, яны яшчэ думаюць, што міністар дапаможа і нават адкажа на просьбы.

Але пролетары Польшчы ведаюць, што хлеб і волю яны заваююць сваімі рукамі. Урад Пілсудзкага—глухі да ўсіх запатрабаваньняў рабочых, і хутка рабочыя пачнуць расплату з сваімі панамі.

М. Мендульскі

Змаганьне працягваецца

(Ліст з Мадрыдзкай турмы)

Шмат гішпанскіх рабочых верылі, ня гледзячы на заўсёдную барацьбу, выкрываючую сапраўдны твар соцыял-дэмократаў, што пасьля абвяшчэньня Гішпаніі рэспублікай усё зьменіцца. Многія верылі, што рэспубліка здаволіць старыя запатрабаваньні працоўных Гішпаніі: хлеба, працы і волі. Але на справе аказалася зусім другое.

Рэспубліканскі буржуазны ўрад нічым не адрозьніваецца ад мінулага старога ўраду.

Рэспубліканскі ўрад расстрэльвае рабочыя дэманстрацыі, кідае сотні рабочых у турмы. Комуністыя прасьледуюцца яшчэ нават больш, бо комуністыя галоўным чынам скідалі маскі з так званых соцыял-дэмократаў. У турмы кідаюць комуністых так, як кідалі і раней, пры старым монархічным урадзе.

Гэты ліст мною напісаны з турмы, куды кінулі мяне тыя, хто так прыгожа дэклараваў свабоду для ўсіх.

Капіталізм зьмяніў такім чынам толькі маску, прыняўшы рэспубліканскую форму кіраўніцтва, бо гэтая форма дае некаторую гарантыю самастрахоўкі супроць нарастаючай рэволюцыйнай хвалі. Масы не пакідаюць сваіх патрабаваньняў, і новы ўрад ужывае ўсе меры, каб спыніць паўстаньне тымі-ж сродкамі, якімі некалі спыняў яго ўрад Прымо-дэ-Рывэра.

Але шмат фактаў сьведчыць аб рэволюцыянізацыі мас. Рабочыя масы ўсё больш і больш пачынаюць упэўнівацца ў тым, што толькі комуністы зьяўляюцца сапраўднымі кіраўнікамі мас у змаганьні за вызваленьне пролетарыяў.

Рэспубліканскі ўрад уводзіць ваенны стан у Мадрыдзе і іншых гарадох, каб спыніць нарастаючае нездавальненьне новым урадам. Хваля паўстаньняў і забастовак—грозная перасьцярога ў тым, што гішпанская рэволюцыя яшчэ ня скончана. Яе шлях—шлях Кастрычніка. І толькі Кастрычнік вызваліць рабочыя масы, толькі Кастрычнік створыць Гішпанскую савецкую рэспубліку, змаганьне за якую працягваецца.

Я. МАРЭКО.

„Жыльлёвае" будаўніцтва для рабочых па-амэрыканску

Беспрацоўныя, якія высяляюцца з кватэр, не атрымліваюць ніякай дапамогі і прымушаны жыць пад адкрытым небам. Беспрацоўныя будуюць самі сабе хібаркі на ўскраіне гораду з каменьняў і розных адкідаў.

На здымку: хібаркі беспрацоўных на ўскраіне гораду Сан-Люіс.

„Прэч крывавыя кіпцюры фашысцкіх катаў ад барацьбітоў за сусьветны Кастры…к!"

Агульны комсамольскі сход курсаў па падрыхтоўцы ў МШВ МБВ чыгункі разам з беспартыйнай моладзьдзю рашуча протэстуе супроць шалёнага тэрору белапольскіх акупантаў у Зах. Беларусі і Зах. Украіне, накіраванага супроць лепшых прадстаўнікоў рабочае класы.

У адказ на зьдзекі польскага фашызму, мы абяцаем: яшчэ больш самкнуцца вакол комуністычнай партыі, наладзіць і паставіць на належную вышыню інтэрнацыянальную работу, усе як адзін, уступаем у рады МОПР'у.

Прэч крывавыя кіпцюры фашысцкіх катаў, ад лепшых барацьбітоў за сусьветную рэволюцыю!

Ад імя сходу прэзыдыум

„Ніякія дэманстрацыі ня будуць дапушчаны"

Паліцэйскі прэфэкт Парыжу забараніў сьвяткаваньне МЮД'у

ПАРЫЖ. Газэта „Эко-дэ-Пары" паведамляе аб тым, што рэволюцыйныя організацыі Парыжа назначылі на 10-е верасьня ў прадмесьці Сэн-Дэні дэманстрацыю для сьвяткаваньня Міжнароднага Дня Моладзі.

Паліцэйскі прэфэкт забараніў дэманстрацыю і папярэдзіў, што ніякія выступленьні на адкрытым паветры ня будуць дапушчаны.

Дэманстрацыя протэсту

Беласток. У сувязі з сьмяротнымі прыгаворам над трыма маладымі рабочымі ў Львове, наша комсамольская організацыя наладзіла дэманстрацыю протэсту. Прайшоўшы некалькі вуліц, пастанавілі разыйсьціся. Але ў гэты час адзін са шпікаў хапае сьцяганосца. Дэманстранты кідаюцца на шпіка. Замест таго, каб павесьці сьцяганосца ў дэфэнзыву, шпік быў прымушаны сам пайсьці ў больні-

Узьлёту зябліва—ударныя тэмпы

Зябліва—гэта высокі ўраджай.

Сельская гаспадарка Савецкага Саюзу зьяўляецца самай буйнай сельскай гаспадаркай у сьвеце. Яна павінна аўладаць і перадавой тэхнікай, культурнымі навыкамі вытворчасьці.

Зяблівае ворыва—ключ к перамогам надыходзячай вясновай сяўбы. Яна на 70 проц. скарачае працоўныя заграты пры вясновай сяўбе, выкарчоўвае дзедаўскія устоі, раздробленую цераспалосную гаспадарку, ламае старыя звычкі і накапівае новы вытворчы вопыт.

Зяблівае ворыва зьяўляецца адной з умоў організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасу.

Да 10 кастрычніка па БССР трэба узьняць на зяб 1670 тысяч га. Выканаць у вызначаны тэрмін гэта заданьне ў нас маюцца усе магчымасьці. Трэба толькі правільна організаваць і расставіць сілы.

У пастанове колгасцэнтру Саюзу аб зяблівым ворыве асабліва выразна надкрэсьлена неабходнасьць дакладна разьмеркаваць цягавую сілу ўнутры гаспадаркі між паасобнымі работамі, якая забясьпечыла-б поруч з правядзеньнем ўборкі, малацьбы і здачы таварнай продукцыі адначасовае правядзеньне зяблівага ворыва і асеньняй сяўбы, не дапускаючы адтэрмінаваньня зябліва да канца ўборкі ўсіх збожжавых хлябоў і асеньняй сяўбы і не расьцягваючы тэрміну зяблівага ворыва.

80 проц. трактароў, 30 проц. конскай цягавай сілы павінна быць кінута на зяблівае ворыва.

Як-жа выконваецца плян зябліва па БССР? На 1-е верасьня па рэспубліцы зябліва узьнята толькі 3.1 проц. пляну. МТС свой плян на 25-е жніўня выканалі на 4,8 проц.

Толькі вынікам дрэннае організацыі працы, опортуністычнай бязьдзейнасьці, недаацэнкай гаспадарча-палітычнай важнасьці зяблівага ворыва, стаўкай на „чарговасьць кампаній", зьмяншэньнем злучыць барацьбу за зябліва з барацьбой за ўборку, асеньнюю сяўбу і збожжанарыхтоўкі магчыма растлумачыць нездавальняючы стан зяблівага ворыва.

Трэба рашуча выступіць у бой за плян зябі. На комсамольскіх ячэйках саўгасаў, колгасаў і МТС ляжыць вялікая адказнасьць за своечасовае выкананьне пляну гаспадарча-палітычных кампаній (уборка, хлебанарыхтоўкі, асеньняя сяўба) і барацьба за зяб.

Комсамольскія ячэйкі павінны стаць ініцыятарамі барацьбы за:

— правільнае разьмеркаваньне цягавай і рабочай сілы па ўборку, малацьбу, асеньні сеў і зяблівае ворыва.

Перавод усіх відаў работы на зьдзельшчыну і брыгадную систэму. Дабіць абязьлічку! Замацаваць за кожнай брыгадай патрэбную колькасьць цягавай сілы, інвентара. Прымацаваць унутры брыгады да кожнага члена брыгады каня і інш. інвэнтар.

— Вызначэньне кожнай брыгадзе цьвёрдага заданьня: каб яна добра ведала, які від работ, на якой плошчы і ў які тэрмін правесьці.

Шырока разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ахапіўшы ім усіх комсамольцаў, моладзь і дарослых колгасьнікаў; правязаць соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам усю работу брыгады.

У барацьбе за выкананьне пляну асеньняй сяўбы і зяблівага ворыва комсамольская ячэйка павінна скласьці конкрэтны опэрацыйны каляндарны плян свайго ўдзелу, расставіўшы сілы на рашаючых вучастках гэтай работы.

Плян зяблівага ворыва на 10 кастрычніка павінен быць выканан. Узьлёту зябліва і асеньняй сяўбе даць ударныя тэмпы.

На гэтых умовах комсамол колгасаў БССР па-баявому выканае пастанову ЦК УсеКП(б):

„Удзяліць асаблівую ўвагу гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў, правільнай організацыі працы, пераходу на зьдзельшчыну, лепшаму выкарыстоўваньню мэханічнай, жывой сілы, разьмеркаваньню прыбытку па колькасьці і якасьці затрачанай працы, актыўнаму ўдзелу ў організацыі ўборкі, у правядзеньні кантрактацыі пры адначасовай упартай барацьбе за далейшае разгортваньне соцспаборніцтва і нагалоўны ахоп ім комсамольцаў".

Руйнуючы ўдар па кулаку і яго агентах—опортуністых усіх колераў, якія імкнуцца перашкодзіць пасьпяховаму выкананьню пляну асеньняй сяўбы і зяблівага ворыва!

Турма гартуе да будучых боек

(Ліст з Баўгарыі)

Усім добра вядомы крывавы шлях баўгарскага фашызму. Але чым больш расьце націск на рабочую клясу, тым шырэй расьце і мацнее рэволюцыйны рух працоўных.

Нядаўна адбыўся ў Софіі чарговы процэс над 17 комсамольцамі. У час суда падсудныя засьпявалі „Інтэрнацыянал". Рабочыя і сяляне, якія былі ў зале суда, далучыліся да комсамольцаў. Усе ўсталі з сваіх месц.

Суд тэрмінова спыніў пасяджэньне. Была выклікана паліцыя, якая разагнала прысутных.

У зале суда засталіся адны падсудныя—комсамольцы. Суд працягваў сваё пасяджэньне. На падсудных суд наклаў арышт у карцары цэнтральнай турмы Софіі на 20 дзён.

Большасьць падсудных рабочыя і вучні, узятыя з прадпрыемстваў і школ за рэволюцыйную працу.

Вось, што расказала на судзе комсамолка Лілія Цэкава аб тых умовах, у якіх яны знаходзяцца ў турме.

— „Нас, палітзьняволеных, зьмясьцілі раней разам з жанчынамі простытуткамі і хворымі на вэнэрычныя хваробы, а потым перавялі да крымінальных злачынцаў. Умовы жыцьця „там вельмі дрэнныя. Адносіны з боку тых, што сядзяць тут, таксама дрэнныя, бо турэмныя вартаўнікі ўвесь час нацкоўваюць на нас „злачынцаў".

— Нас білі і ўдзень і ўначы. Яшчэ і зараз засталіся адзнакі гэтых „таварыскіх адносін". Памяшканьне турмы сырое і цёмнае, шмат хто захварэў і загінуў у турме. Дактары прыходзяць толькі канстатаваць сьмерць.

— Вы, судзьдзі, кінулі мяне ў турму. У ёй я яшчэ шмат чаму навучылася. У турме я навучылася таму, чаго ніколі ня ведала на „волі". Турма ня зьнішчыла маё жаданьне змагацца. Яна загартавала мяне для будучых боек".

Так казалі амаль усе асуджаныя. Прыгавар суда быў кароткі. Зараз усе 17 сядзяць па розных турмах Баўгарыі, асуджаныя на тэрмін—10 год.

Сядзяць за тое, што яны былі членамі Баўгарскага саюзу комуністычнае моладзі.

С. Б.

Баўгарыя.

Пролетарыят БССР протэстуе супроць зьдзекаў фашыстых

ДУБРОЎНА. 6. Сёньня ў горадзе адбылася дэманстрацыя комсамольцаў, піонэраў і беспартыйнай моладзі, прысьвечаная 17 МЮД'у.

Пасьля дэманстрацыі адбыўся мітынг, на якім вынесены рэзолюцыі протэсту супроць зьдзекаў над палітзьняволенымі ў Польшчы.

ЛКСМБ адказвае за плян 1931

КОНВЭЕР--НА ПОЎНЫ ХОД

Комсамольскія организацыі гарбарна-абутковай прамысловасьці неадкладна павінны ўключыцца, па прыкладу гарбарні „Бальшавік", у скразны конвэер якасьці

ЛКСМБ адказвае за выкананьне прамфінпляну 1931 году, ён адказвае за якасьць выпусканай продукцыі.

Гэта вымагае ад комсамольскай організацыі, у барацьбе за тэмпы, за колькасныя паказчыкі прамфінпляну, узьняць на належную вышыню якасьць сваёй працы.

Пушчаны скразны конвэер якасьці, павінен зьявіцца лепшым барацьбітом за тэмпы плюс якасьць.

Нажаль, пададзены сёньня матар'ял паказвае, што комсамольскія ячэйкі, уключыўшыяся ў конвэер, ігнорують масавасьць не прыцягваючы да гэтай працы ўсю моладзь заводу.

Конвэер пушчан

Скразны конвэер якасьці — адно з лепшых мерапрыемств у барацьбе за колькасныя і якасныя паказчыкі промфінпляну. Аднак комсамольскі колектыў гарбарні „Бальшавік" (Менск) не надаў выключнай увагі масавасьці ў гэтым пытаньні. Частка комсамольцаў ня ведае яшчэ аб значэньні конвэеру і аб тым, што апошні пушчан на іхнім заводзе.

У сучасны момант комсамольская організацыя заводу уключылася у скразны конвэер якасьці. Пачалася барацьба за якасьць.

Гаспадарча - разрахунковая брыгада рамшчыкаў першага хромавага цэху, якая ў большай частцы складаецца з комсамольцаў, спыняе штодня партыі недобраякаснага тару. Выносіць ганьбаваньне брыгадам папярэдніх процэсаў, склаўшы вакол гэтага грамадзкую думку рабочых заводу. Прыклад рамшчыкаў павінен перакінуцца ў астатнія брыгады.

Барацьба за якасьць увязваецца з барацьбой за гаспадарчыя разрахунковыя брыгады. Пераведзена 9 брыгад на гаспадарчы разрахунак. Па заводу маецца шмат брыгад у якія працуе значная колькасьць комсамольцаў і рабочай моладзі якія не пераведзены на гаспадарчы разрахунак

Комсамолія чырвона - штандартнага заводу „Бальшавік" павінна памятаць, што пуск конвэера якасьці, барацьба за якасьць, вымагае яшчэ большай напружанасьці і энэргіі у барацьбе за комсамольска маладзёжныя гаспадарча - разрахунковыя брыгады.

Кутман.

Дацьмоладзі кваліфікацыю

Большая частка моладзі, заводу „Бальшавік" (Менск) ня мае кваліфікацыі.

Моладзь на працягу 2-3 год скарыстоўваецца на падсобнай працы, ёй не даецца стымулу для набыцьця і павышэньня кваліфікацыі.

Адміністрацыя адмажоўвае моладзь ад астатняй часткі рабочых, штодня пераводзячы іх з малакваліфікаванай працы на больш кваліфікаваную.

Пытаньнем кваліфікацыі моладзі займаўся комсамольскі колектыў, але належнага пералому няма. Адпаведныя організацыі павінны зьвярнуць на гэта ўвагу.

Рыгор.

Уключыліся у конвэер
(Менск, абутковая)

Комсамольская організацыя фабрыкі па-бальшавіцку не мобілізавалася на ліквідацыю прарыву. Комсамольцы шмат робяць браку, выпускаюць кепскай якасьці продукцыю.

К дню 17 МЮД—накрыць якасны і колькасны прарыў у выкананьні прамфінпляну,—на такі шлях стала комсамольская організацыя. Яна ўключылася ў скразны конвэер якасьці, згуртаваўшы вакол сабе рабочую моладзь.

Фрыд.

За шматмільённую зьмену

Лепшых ударнікаў-комсамольцаў--у кіраўніцтва ПІОНЭР-ОРГАНІЗАЦЫЯЙ

Комсамолія Слуцку, Віцебску, Крупак абавязана ўключыць у сваю работу справу росту піонэр-організацыі

7 месяцаў прайшло з часу 9-га зьезду, які адзначыў што „кіраўніцтва камітэтаў і ячэяк комсамолу піонэр-работай застаецца нездавольняючым, асабліва ў справе падбору і падрыхтоўкі кіраўнікоў".

Гэты час ўнёс зусім мала зьмен у справу кіраўніцтва комсамальскай організацыі БССР піонэр-рухам. Гэта ярка падцьвярджаецца сёньнешнім матар'ялам. Кіраўнікі атрадаў у сваёй большасьці маладыя комсамольцы і не адпавядаюць сваёй рабоце. Асабліва слаба пастаўлена работа па ўзмацненьню росту піонэр-організацыі. Комсамальскія ячэйк не зразумелі політычнай сутнасьці важнейшай задачы ператварэньня піонэр організацыі ў шматмільённую.

Ажыцьцяўляючы рашэньні другога ўсебеларускага зьлёту піанэраў і пастаноў комсамольскіх зьездаў, комсамольскія ячэйкі абавязаны стаць бліжэй да піонэр атрадаў аказваючы ім штодзённую дапамогу і забясьпечыўшы кіраўніцтва піонэр-атрадамі лепшымі ўдарнікамі комсамольцамі

Лепшых комсамольцаў-у кіраўніцтва піонэр-організацыяй

Піонэр-работа у Крупскім раёне пастаўлена зусім дрэнна. Амаль усе піонер-базы ня маюць кіраўнікоў. Кіраўнікі большасьці піонэр-атрадаў зусім маладыя, толькі што зацьверджаныя комсамольцы. На піонэр-работу вылучаюць такіх, якія ня могуць выконваць іншую работу ў ячэйцы. Нават старшыня РБ ДКА зусім малады комсамолец, зацьверджаны мадаўна ў 1931 г. Райком КСМ ніякіх захадаў ня ўжыў, каб выканаць пастанову IX зьезду аб вылучэньні на піонэр-работу лепшых комсамольцаў.

Б.

Так кіраваць піонэр-організацыяй нельга

У мястэчку Леніна (Слуцкага раёну) у 1925 годзе было 3 піонэр атрады. ў 1927 годзе — 2 атрады, у 30 годзе — адзін атрад, а ў 1931 г. у мястэчку няма ніводнага піонэр-атраду. Гэта атрымалася ў выніку адсутнасьці ўсякага кіраўніцтва з боку комсамольскай ячэйкі піонер-атрадамі. У ячэйкі шмат пастаноў аб рабоце піонэр-атрадаў, аднак практычна нічо а ня зроблена. РБ ДКА таксама ня кіруе піонэр-работай.

Шарупіч В.

Рост аддадзены самацёку

Піонэр-атрад пры Вялячыцкай ячэйцы КСМ (Барысаўскі раён) зусім слаба змагаецца за рост. За апошні час піонэр- атрад ня вырас ні на аднаго чалавека. Кіраўнік атраду Ілюшонак зусім слаба кіруе атрадам. Таксама і комсамольская ячэйка не зацікаўлена ў гэтай рабоце.

Рашэньні другога ўсебеларускага зьлёту не распрацаваны. Комсамольская ячэйка павінна зацікавіцца справай ператварэньня піанэр-арганізацыі у шматмільённую зьмену.

Сымон Вянок.

Піонэрскай працай ніхто ня цікавіцца

Піонэр-база пры колгасе „Першага мая" (Віцебск) зусім не працуе У некаторых аддзяленьнях атрады зусім разваліліся. Кіраўнік Мядзелінскага атраду т. Дрыко ігноруе піонэр-працу. Пры цэнтру колгасу засталося каля 10 піонэраў. Аб усім гэтым ведае комсамольскі колектыў але ніякіх захадаў палепшыць работу ня прымае. Гарбюро ДКА таксама слаба кіруе вясковымі атрадамі. Рашэньні другога ўсебеларускага зьлёту не распрацаваны.

Комсамольскаму колектыву неабходна зараз-жа палепшыць работу піонэр-атраду.

Анатоль Вішнёвы.

Піонэр-організацыя павінна сабраць 35 тысяч тон макулатуры

15 верасьня па Беларусі будзе праведзены суботнік па збору макулатуры і рызьзя, які мае асаблівае значэньне, бо дасьць папяровым фабрыкам Беларусі сыравіну, з-за недахопу якое яны значна недавыконваюць прамфінплян.

Піонэр-організацыя заўсёды была ў першых радох, і зараз павінна пабаявому мобілізавацца разам з усёй дзетварой для пасьпяховага правядзеньня гэтага суботніка. ЦБЮП вынесла пастанову, аб удзеле піорган. у гэтай важнейшай справе правядзеньня ўсебеларускага суботніку і паставіла конкрэтную задачу, што мы павінны сабраць 35 тысяч тон макулатуры і 284 тон старых газэт. Піонэр-атрады школ павінны прымацавацца да пэўнага зборпункту ўтыльсыравіны. Кожны атрад павінен мець свае вучасткі, установы, прадпрыемствы.

Неабходна ўстанавіць пасты і брыгады, якія павінны сачыць за сваячасовай адпраўкай паперы і рызьзя на адпаведныя пункты.

Піонэр-організацыя абавязана разгарнуць па пытаньню ўсебеларускага суботніку шырока - растлумачальную работу ў школах сярод дзетвары.

Здабыты торп--ПОЎНАСЬЦЮ НАЛЕЖЫЦЬ ТОПКАМ

Ніводнае цагліны торпу ў расьціле і клетках не аставіць зімаваць

Партыйныя, комсамольскія і профэсыянальныя организацыі заводаў, фабрык і электрастанцый павінны дапамагчы торпазаводам ліквідаваць прарыў у сушцы і ўборцы торпу

За апошні час значна паслабла пролетарская дапамога тарпяной прамысловасьці з боку рабочых заводаў, і колгасьнікаў па ліквідацыі прарыву на адным з важнейшых вучасткаў: сушкі уборкі і транспартоўкі торпу да спажыўца, партыйныя, комсамольскія і профэсыянальныя організацыі заводаў фабрык і электростанцый, колгасьнікі павінны дапамагчы торпазаводам сваячасова ўбраць высушаны торп.

Прыклад комсамоліі Барысава палажыць у аснову практычнага ажыцьцяўленьня шэфства над торпрамысловасьцю.

ПРОЛЕТАРСКУЮ ДАПАМОГУ ТОРП-ЗАВОДАМ

Па Белторпаб'яднаньні на 2-е верасьня торпфінплян выкакан на 50,4 проц. З заводаў толькі „Чырвоны тарпянік" выканаў і перавыканаў сэзонную програму торпаздабычы, даўшы 109,4 проц. Наступныя ідуць заводы: „Закрашынскі мох"—95,1 проц., „Лебяжы шлях" 93,8 проц., „Бальшавік"—88,7 проц. і „Новая Беларусь"—83,5 проц. З ганебным планам прарыву к фінішу прышлі торпзаводы: „Вольніца", выканаўшы заданьне на 10 проц., „Чырвоная Беларусь" на 10 проц., Рэмізава на 10,6 проц., „Вялікі мох" на 12 проц.

Прырост торпаздабычы за апошнюю дэкаду складае 2,9 проц. Па ўсім відаць крывой здабычы торпу тлумачыцца тым, што з 1-га верасьня спыніўся працу машыны элеватарныя і малога гідраторпу.

Зараз здабыча торпу выключна вядзецца фрэзэрным спосабам. Дзённы прырост ідзе на загасаючай крывой. Тэмпы ўзяты нявыстарчальныя. Фрэзэрны торп, які павінен быць рашаючым у ліквідацыі прарыву, не забясьпечвае дастатковай колькасьцю падрыхтаванай плошчы фрэзэраваньня. У верасьні месяцы штодзённы прырост складае ўсяго 0,1 проц. за 22 дні, якія засталіся да канца сэзону, трэба максімальна падняць крывую здабычы фрэзэрнага торпу.

Самым адказным і пагражаючым вучасткам у сучасны момант застаецца сушка, уборка і транспартоўка торпу да спажыўца. На гэтым вучастку ня ўсё ў парадку.

На Асінторпе адгрузка торпу першай Белдрэс, застаецца і надалей вузкім месцам транспортнага аддзелу. Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб давядзеньні вывазкі торпу да 400 ваганэтак у суткі ня выконана. На складзе Белдрэсу няма аварыйнага запасу торпу, што можа паставіць пад пагрозу астаноўкі электростанцыі ў выпадку кепскіх метэоролёгічных умоў, ці аварыі рухомага складу транспорту. Поўнасьцю не механізаваны пагрузачна-разгрузачныя работы. З двух торпазьбіральнікаў, бесьпе абейная работа якіх значна форсавала-б адгрузку торпу, працуе толькі адзін. Асінторп не забясьпечан рухомым складам транспорту: замест 180 ваганэтак маецца 120, з іх каля 20 проц. у рамонце.

Ня лепш справа на торпазаводзе „Міхановічы". Калі тут эдавальняючы ідзе сушка і ўборка торпу ў штабелях, дык адгрузка гатовай продукцыі Эльводу (Менск), заставлена з рук вон кепска. Торпазавод Міхановічы не адгрузіў ніводнай тоны торпу, ня лічачы таго, што нязначная частка торпу вывезена з балота да чыгункі. Сыгналы „Чырвонай Зьмены" не пачуты.

Наогул транспорт торпу да спажыўца пастаўлен надзвычайна дрэнна. Прадугледжаная планам гужавая цяга (60 проц.) не забясьпечваецца сваечасовым вывазам торпу электростанцыям, фабрыкам і заводам. З гэтай прычыны асноўны цяжар вывазкі торпу пераносіцца на сьнежань, студзень, і люты месяцы. Колгасцэнтр адмабілізаваў даць торпзаводам на зімовы час трактары для пагрузачных і транспортных работ.

Апошняя пастанова ЦКК НК РСІ аб перадачы транспорту спажыўцам (за выключэньнем Асінторпу) павінна даць зрух у транспорце торпу, але гэта пастанова ні ў якой меры не зьнімае адказнасьці з [illegible]

У галіне сушкі і ўборкі торпу, торпзаводам неабходна штодзённая конкрэтная дапамога рабочых гораду, колгасьнікаў, партыйна-комсамольскіх і профэсыянальных організацый праз наладжваньне суботнікаў.

Пролетарская дапамога заводам у апошні час значна паслабла. Комсамольскім організацыям гораду, колгасаў, спажываючых торп ці энэргію электростанцыі неабходна аказаць зараз жа пролетарскую дапамогу торпзаводам. Па прыкладу комсамоліі Барысава, дні адпачынку даць на ліквідацыю прарыву ў сушцы і ўборцы торпу. Гэтым самым узмацніць шэфства над тарпяной прамысловасьцю і электрыфікацыяй.

Не паслабляючы асноўнай працы па сушцы, уборцы і транспортоўцы торпу, неабходна пачаць падрыхтоўку да сэзону 1932 г. Між тым большасьць торпзаводаў да гэтага часу ня мае грунтоўных пляна, проэктаў і кантрольных лічбаў падрыхтоўчых работ. Гэта ставіць пад пагрозу невыкананьне плянаў торпаздабычы 1932 году.

Улічыўшы ўрокі мінулага году, зараз-жа прыступіць да падрыхтоўчых работ, гэта—лепшая зарука выкананьня торпфінпляну.

М. П.

Ня ведаюць прамфінпляну

Быхаў. Торпазавод „Чырвоная Беларусь" у выкананьні прамфінпляну значна адстае. На 2 верасьня сэзоннае заданьне выканана на 9 проц. Гэта вынік кепскага адміністрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва.

Брыгады ня ведаюць прамфінпляну сваёй машыны. Новае папаўненьне рабочых барбарскі скарыстоўваецца і не зьявілася штуршком у выкананьні прамфінпляну.

Любаеў

Тармозяць адыходніцтва

ГОРКІ. Працаўнікі Маслакоўскага сельсавету ня ведаюць пастаноў партыі і ўраду аб адыходніцтве і ільготах, якія павінны атрымаць рабочыя адыходнікі, пры налічэньні падатку.

Па гэтай прычыне рабочыя сэзоньнікі з Маслакоўскага сельсавету, якія працавалі на „Цнянскіх" торпарапрацоўках (Менск) не скарысталі ільгот, прадугледжаных пастановамі партыі і ўраду.

Адпаведныя організацыі павінны зьвярнуць на гэта ўвагу Зьнішчыць тармазы на шляху адыходніцтва.

ГАРНЯК.

80 ПРОЦ. ТРАКТАРОЎ, 30 ПРОЦ. КОНЯЙ—НА ВОРЫВА ЗЯБІ

Дакладна разьмеркаваць паміж усімі асеньнімі работамі людзей, трактары, машыны і коняй

Дабіць абязьлічку, укараніць зьдзельшчыну

Ворыва пад зябі нераспачалі

Пухавічы. (Белта). Пастанова НКЗ і Колгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у колгасах не распрацавана. Колгасьнікі ня ведаюць аб пастанове. Зьдзельшчына амаль ня ўжываецца, спуе поадзёншчына. Рад колгасаў практыкуюць разьмеркаваньне ўраджаю па едаках

У большай палове колгасаў вытворчыя брыгады не арганізаваны, а дзе арганізаваны, то не працуюць. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва няма ў паміне. На 30-е жніўня больш 466 кароў, якія падлягаюць абагуленьню—не абагулены. Асеньняя пасеўная кампанія праходзіць вельмі марудна. Нічога ня робіцца па забясьпячаньню насеньнем, бо свайго насеньня ў некаторых колгасах ня хопіць.

Ва ўсіх колгасах не распачата ворыва пад зяб. Колгас імя ЦК КП(б)Б абагуленыя кармы раздае на неабагуленых кароў, ня ведаючы ці хопіць корму для абагуленага гурту.

Райколгассаюз толькі апошнімі днямі склікаў нараду, дзе былі аб аворы пытаньні ліквідацыі прарываў.

Нарада старшынь колгасаў пастанавіла выключыць з колгасу тых колгасьнікаў, якія не абагульваюць пасевы і падлягаючую да абагульненьня маемасьць. Але гэта пакуль у жыцьцё неправодзіцца. Старшыні колгасаў, якія разбазарваюць кармовую базу, ня прыцягваюцца да адказнасьці.


Праца па-новаму забясьпечыла перамогу

У колгасе імя Сталіна Хойніцкага р-ну ўборка тэхнічных культур ужо скончана. Перамогу на фронце ўборкі колгас заваяваў дзякуючы правільнай арганізацыі працы, укараненьню зьдзельшчыны, соцыялістычным методам.

Брыгады, надаўшы асаблівае гаспадарча-політычнае значэньне ўборцы тэхнічных культур, праявілі працоўны энтузіязм. Напружыўшы сілы скончылі ўборку лёну датэрмінова і адразу-ж прыступілі да асеньняй сяўбы і зябі.

Комсамольская ячэйка колгасу не засталася ад барацьбы за ўборку і падрыхтоўку да асеньняй сяўбы не мобілізав ла комсамольцаў і беспартыйную працоўную моладзь на пасьпяховае выкананьне гэтых важнейшых гаспадарча-політычных задач.

Рыгор Музыка.



Колгас „Энэргія“ скончыў асеньнюю сяўбу

Рудзенск. Новаорганізаваны колгас „Энэргія“ Рудзенскага с-с (Пухавіцкі р-н) закончыў асеньнюю сяўбу. Пасеяна 12 га жыта. Колгас „Энэргія“ пераключыўся цяпер на выкананьне пляну ворыва пад зяб і вылучыў брыгаду на дапамогу колгасу „10-годзьдзе БССР“ у правядзеньні асеньняй сяўбы.

Фрыд.

Прыцягнуць да адказнасьці

Асеньняя сяўба і зяблівае ворыва па радзе раёнаў БССР праходзіць зусім нездавальняюча. На 1-е верасьня па БССР засеяна 53.025 га, што складае 4 проц.

У Брагінскім раёне пад зябліва ўзьнята 9,5 проц., у Ельскім р-не —9,9 проц., у Нараўлянскім зусім нічога. Гэткае становішча назіраецца ў шмат іншых раёнах. Кіраўніцтва райза пералічаных раёнаў і райколгассаюзы ня ўжылі энэргічных мер, каб выканаць плян асеньняй сяўбы і ворыва на зяб.

Наркамзем БССР за непрадстаўленьне заключных справаздач аб правядзеньні вясеньняга севу абвясьціў вымову загадчыкам райза Расьнянскага, Асьвейскага, Барысаўскага і Тураўскага раёнаў, а загадчыкам Койданаўскага, Уваравіцкага, Брагінскага, Ельскага, і Нараўлянскага райза паставіў на від.

Трэба, каб Наркамзам Беларусі ўжыў самыя суровыя меры да загадчыкаў райза

Міхась Ракіта

Дамо сьвежую і добраякасную гародніну рабочым цэнтрам

Рэйд чырвоназьменаўскіх брыгад паказаў, што рад арганізацый к прыёму гародніны не падрыхтаваны

Патрэбна ўмяшаньне РСІ

ЦК УсеКП(б) у сваёй апошняй пастанове аб організацыі загатовак плодагародніны для рабочых цэнтраў даў зусім ясную і выстарчальную дырэктыву. Аднак, зьмяшчаны сёньня матар'ял прымушае біць трывогу. Опортуністы з Белплодагародніны не адчулі важнасьці гэтых дырэктыў і ігноруюць іх, пусьціўшы загатоўкі плодагародніны на хвалях самацёку.

Плян завозу і загатоўкі гародніны за апошні квартал выкананы ўсяго на 46-50 проц. Замест добраякаснай гародніны, рабочы спажывец атрымлівае брудную і ў мізэрнай колькасьці і прымушан купляць яе на прыватным рынку.

Бруд, сьмецьце, безгаспадарчнасьць і безадказнасьць пануе на базах МЦРК, ТПО, Белплодгародніны. Склады і хавальнікі не падрыхтаваны да прыёму гародніны.

Органы РСІ павінны пакласьці канец бяздушным, опортуністычным адносінам Белплодагародніны да забесьпячэньня ў тэрмін буйнейшых рабочых цэнтраў сьвежай і добраякаснай гароднінай.

Рабочыя масы, комсамольскія організацыі, павінны ўзяць контроль над загатоўкай гародніны, прасоўваньнем яе ад месца адгрузкі да спажыўца.

Дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб організацыі загатовак пладагародніны павінны быць выкананы, а галавацяпы з Белплодгародніны і баз МЦРК і ТПО прыцягнуты да адказнасьці.

Белплодагародніна працуе на хвалях самацёку

Плян нарыхтовак па лініі Белплодагародніны знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК аб правядзеньні падрыхтоўкі да нарыхтоўчай кампаніі сярод работнікаў белплодагародніны не распрацоўвалася.

Уся праца праходзіць самацёкам. Дырэктывы партыі і ўраду аб сваячасовым забясьпячэньні рабочых цэнтраў не выконваюцца.

Згодна пляну наркомснабу за мінулы квартал трэба было нарыхтаваць 400 тон буракоў, морквы, капусты і цыбулі, нарыхтавана 146 тон, альбо 46 проц. квартальнага заданьня. Яблык і груш з патрэбных 5900 тон, нарыхтавана 375 тон. Работнікі Белплодагародніны тлумачаць гэты прарыў, правядзеньнем нарыхтовак толькі па аднаасобным сэктары (?!).

Прыгарадныя колгасы прывозяць у Менскі ЦРК розную плодагародніну і там яе ня прымаюць. Колгасы вымушаны кідаць продукты на прыватны рынак. А рабочыя купляюць гародніну не ў МЦРК, а ў прыватніка, пераплачваючы ў тры дарагі. Опортуністыя з Белплодагародніны думаюць, што буракі, капуста і морква самі пацякуць у крамы і базы.

Опэратыўнае кіраўніцтва раёнам адсутнічае. Дырэктар Белплодагародніны на запытаньне, як вы кіруеце раёнам, адказвае: Мы пасылаем паперкі, тэлеграмы, ну, і калі-ніколі выяжджаюць інструктары„. Але інструктары выяжджаюць ня туды, куды патрэбна. У раёны, дзе вельмі дрэнна ідзе нарыхтоўка, як Брагінскі, які замест 30 тон выканаў 10, Веткаўскі замест 60 тон—4, Лельчыцкі, замест 50 тон—0, Лепельскі, замест 30 тон—10 цэнтнэраў, інструктары Белплодагародніны не выяжджаюць. У той час, як рабочыя цэнтры Гомель, Віцебск ня маюць бульбы. Цэлы рад раёнаў не даюць вестак аб адгрузцы і загатоўцы гародніны. (Пухавіцкі, Полацкі, Магілёўскі, Бабруйскі і Барысаўскі). Прыгарадныя гаспадаркі маюць 100 га раньняй бульбы, якая і па сучасны момант ня выкапана.

Адгрузка праходзіць нездавальняюча, асабліва такім гарадом, як Гомелю і Віцебску. Гародніна валяецца на голай зямлі, альбо на мокрым памосьце і псуецца. Гародніна з Рагачоўскага, Мазырскага і іншых раёнаў дае 20-25 проц. адкідаў.

Накладныя выдаткі на гародніну вельмі вялікія. Белплодагародніна на месцы купляе кілё яблык па 27 кап, а прадае па 60-65 кап. Такім чынам, цэны ўзьнімаюцца на 100-150 проц. Такое становішча і з памідорамі, буракамі і гуркамі.

Будаўніцтва хавальняў праходзіць маруднымі тэмпамі. Плян выканаваны на 35 проц. Па радзе раёнаў будаўніцтва зусім сарвана. Напрыклад, Аршанскі ЦРК і па сучасны момант не адрамантаваў хавальняў на 25 вагонаў плодгародніны. Белплодагародніны гэты прарыў тлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі; адсутнасьцю будаўнічых матар'ялаў.

Нарыхтоўка плодагародніны пад пагрозай зрыву. Мы зварочваем увагу органаў РСІ, якія павінны зацікавіцца гэтым пытаньнем.

Брыгадзір „Ч. З.“ М. Ракіта



Выратаваць 9 тон капусты

Налёт „чырвоназьменаўскай“ брыгады на плодагародную базу МЦРК выявіў рад недахопаў і безадказнасьці. У загатоўках гародніны на базе пануе бруд. Куча сьмецьця ужо больш 5 дзён ня вывозіцца з двара. Разлажэньне і смурод ахапляюць усю базу і заражаюць завезеную сьвежую гародніну.

9 тон бяспрытульнай капусты пачало загніваць. Галавацяпы з кіраўніцтва базы „ня ведаюць“ каму яе нележыць накіраваць. Гнілая капуста на адкормачныя пункты не адсылаецца, працягваючы гніць яна заражае рэшту сьвежай капусты. Тары, якой ў нас вялікі недахоп, на базе валяюцца горы: бочкі, скрынкі, мяхі... Чамусьці ніхто ёю ня цікавіцца.

У падвале, куды неўзабаве трэ' будзе ссыпаць бульбу на зіму і хаваць гародніну, — вільгаць і вада.

Для рэалізацыі прамовы Сталіна нічога ня зроблена. У зарплаце пануе ўраўнілаўка соцспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута, няма зьдзельшчыны.

Партыйныя організацыі МЦРК і РСІ павінны гэтым зацікавіцца.

Брыгада „ЧЗ“ КАЦ, РУБІНШТЭЙН.

У ЗМАГАНЬНІ ВЫРАСЬЛІ

Надыходзіла другая бальшавіцкая вясна. У трох вярстах ад станцыі Царахоўка-Буцеўскі сельсавет. Гаспадарак у сельсавеце шмат, а ў колгасе толькі 37.

Кулацтва з надыходам вясны узмацніла тэмпы сваёй „работы“.

На дзьверах сельсавету аб'ява: „Сёньня ўвечары тэрмінова паседжаньне бюро ячэйкі ЛКСМБ. Запрашаюцца ўсе комсамольцы“.

Увечары сэкратар чытае дырэктыву: „РК ЛКСМБ прапануе пасіліць тэмпы колектывізацыі сельсавету“. З гэтага і пачалося. Вылучылі брыгады, пачалася барацьба за колектывізацыю, за колгас.

Самым цяжкім у гэтай адказнай рабоце была політычная няпісьменнасьць большасьці комсамольцаў: яны блыталіся на сходах, а кулаку гэта на руку.

Штурм пачаўся. Часта скліканіся агульныя сходы ячэйкі, на якіх комсамольцы дзяліліся ўражаньнем.

Цяжка. Некалькі комсамольцаў пачалі хныкаць і не пайшлі ў калгас. Справа ўскладнілася. Кулак атрымаў лішні козыр.

Увечары сэкратара ячэйкі паведамілі, што комсамольцы пачалі выходзіць з колгасу „Бальшавік“ стойкія кінуліся ў колгас. Ва ўсіх адна думка —затрымаць развал колгасу да заўтрага. А заўтра—за дапамогаю ў рай колгассаюз і райком комсамолу.

Ля праўленьня колгасу сустрэлі жанчыны. Пасыпалася лаянка. Пад калючымі словамі насьмешак, як пад кулямі, прайшлі ў хату. З колгасу пасьпела ўжо выпісацца 40 гаспадарак і ўсе, як адзін, сэктанты. Справа адразу стала зразумелай. Як і чакалі, сэктанты агітавалі за выхад з колгасу. Але комсамольцы прышлі ў тэрмін.

Распачаўся сход. Сэкратар першы:

—Таварышы! Паслухалі кулака.„

З вуліцы у вакно крык: „Далоў, далоў сапляко́ў. гнаць іх трэба, куды яны нас цягнуць“...

Надыйшла рашучая хвіліна, Кулацтва сабралася вакол хаты. З ім радам падкулачнікі і сэктанты. Комсамольцы і колгасьнікі ў хаце.

— Здадзім мы—ўсё прапала—кінуў сэкратар.

У кожнага прамільгнула думка: „Трымацца да апошняга, а заўтра ў раён за дапамогай“. З вуліцы крык і гвалт не суніма́ўся. Кулакі са зграяй падпявал пачалі з вуліцы біць вокны.

Сэкратар крычыць:

— Хлопцы, трымацца да апошняга! Хто ня хоча быць у колгасе, ідзеце на вуліцу.

Нерашуча пераступала парог некалькі чалавек, але так засталіся стаяць не пераступіўшы. Стала лягчэй. Убачылі відавочна, што асноўная бядняцка-серадняцкая частка вёскі за колгас і тут-жа пастанавілі: „Заўтра-ж абагуліць насеньне і ўсю маёмасьць, а хто гэтага ня зробіць, лічыць выбыўшым з колгасу“.

Разыходзіліся з адною думкай: „Абагуляць усю маёмасьць ці не? Кулак і яго агенты атрымалі паражэньне. Колгасьнікі абагулілі маёмасьць, а хто вышаў з колгасу, прышлі прасіцца зноў. Назаўтра сход колгасьнікаў. Склалі ўдарныя маладзёжныя брыгады. Колгасьнікі добраахвотна павялічылі працоўны дзень на дзьве гадзіны. Увялі зьдзельшчыну, наладзілі дакладны ўлік працы і вясновую сяўбу закончылі раней тэрміну на 5 дзён.

У рэзолюцыі ўрачыстага кустовага сходу колгасьнікаў, прысьвечанага скончэньню сяўбы, коратка напісана: „Змагацца за ператварэньне Буцеўскага сельсавету да асеньняй сяўбы ў сельсавет суцэльнай колектывізацыі“.

Галасавалі. Прынялі аднагалосна.

Вялікім сьвятам для Буцеўскай комсамольскай ячэйкі быў гэты ўрачысты сход, які запісаў у гісторыю існаваньня комсамольскай ячэйкі рад перамог на гаспадарчым фронце.

Шэсьць новых колгасаў створана па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі.

Вось чаму комсамольцы ў дзень урачыстага сходу мелі ўрачысты настрой. Яны мелі для гэтага падставы; яны перамаглі на гаспадарчым фронце, яны вырасьлі за гэты пэрыод з малюсенькай ячэйкі ў моцны комсамольскі колектыў.

Ужо зараз некаторыя сельсаветы колектывізаваны на 100 проц., раён колектывізаваны на 57 проц.

Комсамолія Царахоўшчыны, якая на ўласных прыкладах барацьбы з кулацтвам на ўласных прыкладах барацьбы за колектывізацыю навучылася змагацца па-бальшавіцку, пад кіраўніцтвам КП(б)Б змагацца за колектывізацыю па-ўдарнаму разам з партыяй вядзе Царахоўшчыну да суцэльнай і на яе аснове ажыцьцявіць ліквідацыю кулацтва як клясу.

Курганскі П.

З фронту рэалізацыі пазыкі „трэцяга рашаючага“

ТРЫ ДАНЯСЕНЬНІ НАШЫХ ЮНКОРАЎ

Колгас „Чырвоны Май“ і Дубровенскі гарсавет прэміяваны

За добрую работу па рэалізацыі сярод насельніцтва пазыкі „трэцяга рашаючага“, за перавыкананьне сумы падпіскі прэміяваны: Дубровенскі гарсавет на 150 р. і колгас „Чырвоны Май“ Ставашынскага сельсавету на 125 р.

Не пераключыліся

Асабліва адстае ў рэалізацыі пазыкі „трэці рашаючы“ сярод аднаасобнікаў Стахоўскі сельсавет (Барысаўскага раёну). За наяўны рэзерв не рэалізавана ніводнай абліга́цыі, а заявак сярод аднаасобнікаў з 13 двароў атрымана на 100 р. Гэта пры кантрольнай лічбе ў 170 р.

Пры гэткім дрэнным становішчы рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў, у колгасах кантрольная лічба перавыканана. Гэта ізноў-жа сьведчыць аб няўменьні мясцовых організацый сваячасова пераключыцца на рэалізацыю пазыкі сярод аднаасобнікаў.

Зусім дрэнна пастаўлена афармленьне падпіскі.

БУРДА Ул.

Ячэйка не працуе а аднаасобнікі плятуцца ў хвасьце

У Каменскім сельсавеце Ельскага раёну ніякай работы сярод аднаасобнікаў па рэалізацыі пазыкі „трэці рашаючы“ не праводзіцца. Комсамольскія ячэйкі нічога ня робяць. Заданьне РК КСМ на 300 р. па раёне ня выконваецца. Спэцыяльна вылучаныя комсамольцы для работы па рэалізацыі пазыкі яшчэ не прыступілі да працы.

У выніку аднаасобнікі Каменскага сельсавету плятуцца ў хвасьце ўсяго раёну па рэалізацыі пазыкі.

Зьм. ВІШНЁВЫ

Барацьба з рэлігіяй—барацьба за соцыялізм

Рэлігія--адна з галоўных зачэпак капіталізму ў нашай краіне

Разгорнем сыстэматычную і глыбокую антырэлігійную работу за шматмільённыя атрады ваяўнічых бязбожнікаў

(З тэзісаў для дакладчыкаў пры правядзеньні антырэлігійнай кампаніі ў сувязі з асеньнімі яўрэйскімі сьвятамі)

1. „Пролетарыят, вышаўшы з капіталістычнай грамады, доўга носіць на сваім целе балячкі ад гэтае грамады" (К. Маркс). Сярод гэтых балячак, спадчыны капіталізму, найагіднейшай зьяўляецца рэлігія.

Рэлігійная ідэолёгія цалкам і поўнасьцю ідэолёгія буржуазная. Гэта відавочна з асноўных рэлігійных палажэньняў: „Усе людзі браты", „любіце сваіх ворагаў", ня толькі не пасягайце на прыватную ўласнасьць, але нават і не жадайце яе",—кажа X запаведзь закову.

Пропаведзьдаю клясавага міру рэлігія адцягвае працоўных ад рэвалюцыйнай барацьбы, выхоўваючы індывідуалізм, і варожа адносіцца да колектывізму.

Адсюль зусім зразумела, чаму буржуазія за межамі і кулацкія элементы ўнутры СССР упарта і настойліва падтрымліваюць рэлігію.

2. Працоўныя яўрэі, дзякуючы Кастрычніку, скінулі з сябе падвойны прыгнёт—сваёй і расійскай буржуазіі, вызваліліся ад капіталістычнай эксплёатацыі, нацыянальнага бяспраўя і культурнае адсталасьці.

З забітых, бяспраўных эксплёатуемых парыяў, загнаных у душную „черту" царскай турмы народаў, працоўныя яўрэі сталі разам з усім пролетарыятам і працоўнымі масамі сялянства СССР актыўнымі ўдзельнікамі будаўніцтва соцыялізму. Але трэба заўважыць, што контррэволюцыйныя элементы выкарыстоўваюць нацыянальныя забабоны і распальваньне [illegible]. Клясавая барацьба прарываецца у нас часам у антысемічных выхадках, якім савецкая ўлада, савецкая грамадзкасьць даюць рашучы адпор.

Камуністычная партыя і савецкая ўлада вядуць бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, які пад выглядам інтэрнацыяналізму імкнецца падараваць прынцып нацыянальнага раўнапраўя, імкнецца ігнараваць нацыянальныя асаблівасьці мовы, культуры і быту. Гэтыя шовіністычныя настроі тармозяць соцыялістычнае будаўніцтва, да якога адсталыя нацыянальнасьці, стагодзьдзямі знаходзячыся пад цяжкім ціскам царскага рэжыму, могуць па-сапраўднаму падыйсьці толькі пры ўмове разьвіцьця нацкультур.

Накіроўваючы галоўны ўдар супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, партыя пролетарыяту змагаецца і супроць нацыянальнай абмежаванасьці і замкнутасьці, супроць мясцовага нацыяналізму, які ў процілегласьць вялікадзяржаўнаму шовінізму адмежаваецца ад усёй масы працоўных, затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры нацыі і тым самым аслабіць адзінства працоўных СССР.

На жаль, рэлігійны яд у нас сярод працоўных яшчэ канчаткова не зьнішчаны. Яшчэ ня зжыты нацыяналістычныя забабоны, у прыватнасьці і сярод працоўных яўрэяў. Рэлігія і клерыкалы з асаблівай імкнуцца зрабіць уплыў на веруючых у дні рэлігійных сьвят. У гэты час клерыкалы прапагандуюць веруючым рэлігійны яд вялікімі дозамі.

Рэлігія адурманьвае працоўных, палохае іх страшным судом, пякельнымі мукамі і г. д. У гэтых адносінах яўрэйскія асеньнія рэлігійныя сьвяты, як і сьвяты іншых рэлігій, выконваюць сваё контррэволюцыйнае прызначэньне.

3. На фоне ажыцьцяўленьня пяцігодкі адбываецца абвострaная клясавая барацьба. Усімі спосабамі нэпманска-кулацкія элементы імкнуцца прыпыніць соцыялістычны наступ пролетарыяту. Пачынаючы ад абрэза і „чырвонага пеўня" і канчаючы рознымі хітраваньнямі, клясавы вораг абараняе кожны крок сваіх позыцый.

Тут і выяўляецца роля рэлігіі ў нашых умовах. Рэлігія—адна з галоўных зачэпак капіталізму ў нашай краіне. Кулак карыстаецца рэлігіяй, як зброяй супроць соцыялістычнага будаўніцтва. Рэлігійныя організацыі зьяўляюцца яго палітычнымі штабамі Царква, касьцел, сынагога і сэкты існуюць легальна, маюць апарат матар'яльныя сродкі і сувязі. Гэты апарат к паслугам кулака.

Рэлігія яшчэ прыцягвае да сябе адсталыя масы працоўных, грае на іх рэлігійных пачуцьцях і выкарыстоўвае гэтыя пачуцьці супроць савецкай улады і соцыялістычнага будаўніцтва. Рэлігійныя організацыі ў нашых ўмовах, гэта—асяродкі кулака нэпмана, папы ксяндзы, равіны, сэктанты—іх агітпропы.

Рэлігійнасьць адсталых слояў працоўных выкарыстоўваецца духоўнікамі ў контррэволюцыйных шкодніцкіх мэтах.

4. Асноўнае, што яўрэйскія клерыкалы імкнуцца навязаць працоўным у сувязі з асеньнімі рэлігійнымі сьвятамі „грозныя дні", заключаецца ў тым, што ў дзень новага году „намячаецца на небе" удзел кожнага чалавека на ўвесь надыходзячы год, а ў „судны дзень" (Іом-кіпур) на небе адбываецца суд над кожным чалавекам паасобку і выносіцца богам канчатковы прысуд.

Усе ліхія гадзіны зьвязаныя з эксплёататарскім урадам, клерыкалы і буржуі тлумачаць пакараньнем за грахі, што ўсё гэта вытвараецца па „волі боскай", таму працоўны павінен маліцца, класьці паклоны, пакарыцца эксплёататарам і тады пан-бог зьмілуецца над цяжкім становішчам.

„Вучэньне" аб граху павінна адцягваць увагу эксплёатуемых ад сапраўдных прычын іх бед—клясавай эксплёатацыі, Рэлігія прапануе ўсе надзеі складаць не на сябе, не на сілы сваёй клясы, не на сваю волю к барацьбе супроць эксплёататараў, а на волю неіснуючага бога. У гэтым клясавы сэнс асеньніх яўрэйскіх рэлігійных сьвят—новага году, „Іом-кіпура" і „кушчай". У гэтым таксама захоўваецца клясавы сэнс хрысьціянскіх і іншых рэлігійных сьвят.

5. Усе рэлігіі ўвесь час нязьменна служылі і служаць адной мэце—асьвячэньню і замацаваньню ўлады эксплёататараў, затушоўваньню клясавых супярэчнасьцяў, адурманьваньню прыгнечаных мас шкоднымі рамантычнымі марамі аб нацыянальным адзінстве, выхалошчваньню ў іх энэргіі да барацьбы супроць соцыялістычнага гнёту, які малюецца рэлігіяй, як закон, вызначаны „самым госпадам богам за грахі людзкія".

Духоўніцтва ўсіх масьцей і гатункаў мае ад гэтага вялізарныя матэр'яльныя выгады, зьбіраючы „дабраахвотныя даяньні" веруючых. Біблія ў гэтых адносінах зусім адкрыта кажа: „ніхто не павінен зьяўляцца перад тварам Ягвэ (імя бога) з пустымі рукамі".

У часы царызму падтрымліваўся цесны саюз між рабінамі, яўрэйскай буржуазіяй і ахранкаю для організацыі барацьбы з рэволюцыйным рухам працоўных. На зьезьдзе рабінаў у 1903 г. прынята наступная пастанова: „Рабіны павінны імкнуцца выкарчоўваць ідэі соцыялізму сярод яўрэяў. Ні ў водным доме не павінна быць кніжок, газэт, портрэтаў, якія-бадносіліся да соцыялістычных партый, бо гэта зьяўляецца сьмяротным ядам". Гэтую пастанову табачны фабрыкант Шаршаневіч у Горадні за свой кошт паклеіў на кардон і павесіў ва ўсіх сынагогах.

Выконваючы волю сусьветнага капіталу, рабіны ідуць у першых радох барацьбітоў „крыжовага паходу" супроць СССР. Як вядома, рабіны Польшчы, Амэрыкі, Англіі і інш. раін узмоцнена пропагандуюць ідэі антысавецкай інтэрвэнцыі. Яны далучыліся ў 1930 годзе да „крыжавога паходу" папы рымскага супроць СССР. Ерусалімскія рабіны склалі спэцыяльную малітву, якую раяць чытаць „братом ўрэям": „Хай будзе воля твая, божа, каб ты адпомсьціў за сваё сьвятое імя грэшнікам, імянуючым сябе бальшавікам і зьнішчыў іх уладу з твару зямлі".

У справе падрыхтоўкі новай вайны супроць СССР і ў справе барацьбы з рэволюцыйным рухам яўрэйскія рабіны не адстаюць ад каталіцкіх ксяндзоў, праваслаўных папоў, сэктанцкіх прапаведнікаў і інш. духоўнікаў.

Зразумела, што ў СССР рабіны і нэпманы не асьмельваюцца адкрыта выступіць супроць дыктатуры пролетарыяту, але шмат якія факты сьведчаць аб тэй злобнай ненавісьці, з якою гэтыя ворагі пра оўных вядуць падрыўную работу, каб зьменшыць тэмп разгортваньня соцбудаўніцтва, сарваць выкананьне прамфінпляну, перашкодзіць колектывізацыі, пасеяць розьнь унутры пролетарыяту, распаліць нацыяналістычныя пачуцьці адсталай часткі працоўных яўрэяў, якія знаходзяцца яшчэ ў палоне рэакцыйнай рабінскай ідэолёгіі.

Узмацнім антырэлігійную працу сярод працоўнага насельніцтва БССР наогул і сярод працоўных нацменшасьцяй і працоўных яўрэяў у прыватнасьці.

Не павінна быць ніводнага прадпрыемства цэху колгасу саўгасу школы установы і вайсковай часткі, дзе-б ня было ячэйкі „Ваяўнічых бязбожнікоў"

Далоў рэлігійныя сьвяты, якія зьяўляюцца сьвятам цемры і эксплёататарскага абману!

Літаратура для дакладчыкаў (на яўрэйскай мове)

а) Ленін—аб рэлігіі.

б) Навакоўскі—яўрэйскія рэлігійныя сьвяты.

в) Клерыкалы і шкоднікі перад пролетарскім судом.

г) Рабіны на службе фінансавага капіталу

д) А. Рабіновіч—Яўрэйскія асеньнія сьвяты (на рас. мове).

е) Што рабіць бязбожнікам у колгасе (на бел. мове).

Цэнтральны Савет ваяўнічых бязбожнікаў.

Польскія ўдарнікі фабрыкі палёў віцебшчыны протэстуюць супроць крывавага тэрору ў фашыстоўскай Польшчы

ВІЦЕБСК. 7-IX (БЕЛТА). Польская рабочая і колгасная моладзь Віцебшчыны на сваім зьлёце прынялі наступны протэст супроць крывавага тэрору ў Польшчы.

—Польшча гэта край гінучага капіталізму, край найглыбейшага заняпаду, адчуваючагася прамысловага і аграрнага крызісу, беспрацоўя, край нацыянальнага ўціску і карных экспэдыцый. Польшча — турма народаў 10.000 найлепшых сыноў рабочае класы і рэволюцыйнага сялянства знаходзяцца ў крывавых кіпцюрох фашысцкіх апрычнікаў.

Урад Пілсудзкага хватаецца за сродак фізычнага зьнішчэньня авангарду рабочае класы і працоўнага сялянства, змагаючагася за вызваленьне з пад сацыяльнага і нацыянальнага ярма.

Конфэрэнцыя польскай рабочай і колгаснай моладзі Віцебскага раёну рашуча протэстуе супроць зьвярынага разьюшанага польскага фашызму на правы і жыцьцё палітычных вязьняў.

У адказ на фашыстоўскі белы тэрор і падрыхтоўку да антысавецкай вайны канфэрэнцыя працоўнай моладзі Віцебшчыны абавязваецца:—энэргічна ўзмацняць абараназдольнасьць краіны, узьняць кампанію па збору сродкаў, на пабудову заводу танкаў імя Дзяржынскага, узмацніць і пашырыць ударныя брыгады на заводах і колгасах для таго, каб выканаць і перавыканаць пляны 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Дэманстрацыя магутнасьці

Учора адбылася моладзевая дэманстрацыя менскай комсамолі і працоўнай моладзі.

Пасьля працы, а 5 гадзіне, ад варштатаў працоўная моладзь Менску з баявымі лёзунгамі, як я апавядалі аб перамогах на гаспадарча-палітычным фронце, дэманстравала сваю магутнасьць, сваю адданасьць ленінскай партыі.

Моладзевая дэманстрацыя вылілася ў дэманстрацыю салідарнасьці працоўных капіталістычных краін, у пратэст супроць нечалавечых, нечуваных зьдзекаў польскага фашызму над палітзьняволенымі.

БІБЛІОГРАФІЯ

К. І. Шапялевіч. Рабочая кніга па беларускай мове. Для 3-га году навучаньня. Менск. БДВ, 1931 Цана 75 к,

В. Самцэвіч. Соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі. Рабочая кніга для 4-га году навучаньня. Менск. БДВ, 1931 г. Цана 50 кап.

Прыгоднасьць кожнае кнігі для нас—няхай гэта навуковая, мастацкая, а тым больш школьны падручнік—мы павінны расцэньваць з наступных бакоў: наколькі яна ўзбройвае масы ідэямі пролетарыяту і наколькі ўскрывае і дае бой варожым пролетарыяту плыням, наколькі стымулюе падымае масы на барацьбу за прамфінплян, за мэтоды соцыялістычнай працы і наколькі правільна трактуе генэральную лінію партыі.

„Рабочая кніга Шапялевіча з пункту погляду мэтодыкі пабудавана і ілюстравана ня кепска: Элемэнтаў граматыкі падана даволі. Паколькі аўтар ніякіх новых фонэтычных, морфолёгічных і сынтаксычных палажэньняў ня высоўвае, дык з гэтага боку падручнік разглядаць ня будзем.

Матар'ял, які праводзіцца аўтарам для практыкаваньняў, узораў—новы, але перасыпаны такімі прыкладамі: „Няхай нас сустрэнуць грамады працоўных людзей", майстрове, які бацька, такі сын", „Ціт ідзі малаціць" і г. д. а таксама і ўрыўкамі нацыянал-дэмократычных вершаў.

Гэта гаворыць за тое, што Шапялевіч не закапапаціў дзьвярэй ад прасякненьня нацыянал-дэмократычнага паветра ў яго кнігу, наадварот—адкрыў вялікую шчыліну для яго. Нацыянал-дэмократызм увайшоў у кнігу з нацыянал-дэмократычнай „марсэльезай", з прылізанымі пад польскі густ словамі, з ігнараваньнем творчасьці пролетарскіх пісьменьнікаў для граматычных прыкладаў.

У рабочай кнізе ёсьць, прыкладам такія дэвізы і разважаньні аўтара: „бог—зьверская выдумка капіталістых", што сяляне, моў, організаваліся ў колгас толькі тады, як склалі з рабочымі ўмову аб прысылцы машын у вёску. Такая трактоўка рэлігіі і колектывізацыі—„зьверская выдумка" самага аўтара,

Кніга Самацэвіча—школьная навінка. Аўтар імкнецца популярнай мовою выклажыць вучням разьвіцьцё соцыялістычнай сельскай гаспадаркі па 5-гадовым пляне. Закрануты ўсе галіны сельскае гаспадаркі: колгаснае і саўгаснае будаўніцтва, клясавая барацьба, жывёлагадоўля, тэхнічныя культуры, праца, падрыхтоўка кадраў і г. д. Запатрабаваньні на такую кнігу ў школе вельмі вялікія, аднак, вялікія, з нашага пункту погляду, яе памылкі і недахопы.

Сьцьверджаньне аўтарам аб тым, што „Наша пяцігодка—шлях да соцыялізму" (стр. 11) ня вычэрпвае сутнасьці яе на сёньняшні дзень. Пяцігодка ёсьць програма разгорнутага наступу соцыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя і програма завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі.

Па Самцэвічу сучасная сувязь рабочае клясы з сялянствам выглядае так: „Абапіраючыся на батракоў і вясковую бедноту і ў цесным саюзе з серадняком, рабочая кляса вядзе змаганьне з кулакамі і перабудоўвае сялянскую гаспадарку на соцыялістычны лад" (Стар. 70)

Апора рабочае клясы на батрацтве і беднаце, саюз з серадняком вызначае разьвіцьцё вёскі толькі да колгаснае брамы. За брамай „колгасьнікі зьяўляюцца сапраўднай і моцнай апорай савецкае ўлады" (з рэзолюцыі XVI-га парт'зьезду). Мы не ўпамінаем пастановы зьезду саветаў аб бедняку і серадняку, якія яшчэ не ўвайшлі ў колгасы.

Аўтар далей павучае: „каб пабудаваць соцыялізм у нашай краіне, мы павінны дагнаць і перагнаць перадавыя па тэхніцы і разьвіцьці прамысловасьці капіталістычныя краіны" (стар. 13).

„Вось чаму комуністычная партыя зварочвае такую ўвагу на тэмпы індустрыялізацыі нашай краіны..." (стар. 14).

Паводле пададзеных слоў аўтара выходзіць, што мы соцыялізм пабудуем толькі тады, як дагонім і перагонім капіталістычныя краіны. Гэта сьцьвярджэньне таксама няправільнае. Савецкі саюз, з тэхнікай, якую ён мае ў сваім распараджэньні, ужо ў гэтым годзе закладае фундамант соцыялістычнай экономікі,—гэта па-першае, а па-другое, шпаркія тэмпы прадыктаваныя міжнароднымі абставінамі патрабуюць, каб мы ў самы кароткі гістарычны тэрмін, на працягу бліжэйшых 10 год, зьнішчылі нашу тэхнічную і культурную адсталасьць і зрабілі нашу краіну магутнай цытадэльлю міжнароднага пролетарыяту.

Аўтар у сваёй кнізе зваліў у адну кучу дзьве розныя палітыкі партыі; палітыку абмежаваньня і выцясьненьня кулака з палітыкай ліквідацыі яго як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Клясавую барацьбу Самцэвіч бачыць толькі да ўступленьня сялян у колгасы, а пасьля ўсё ідзе як па масьле; у той час, як элемэнты клясавай барацьбы маюцца і ў колгасе, толькі ў іншых формах.

Не адзначае аўтар і таго, што посьпехі ў галіне колектывізацыі дасягнуты партыяй у барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і „левымі" загібамі, і на Беларусі—і з нацыянал-дэмократычнай прышчэпаўшчынай.

Мала матар'ялу ўзята для кнігі з БССР. Нічога ня сказана аб вучоце працы і зьдзельшчыны ў колгасах.

Пры карыстаньні гэтымі кнігамі настаўнікі павінны ўскрыць вучням памылкі палітычнага зьместу, асабліва ў кніжцы Самцэвіча, і наогул даць ім належную крытыку.

С. Вязін.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Да ведама студэнтаў Менскага вячэрняга комвузу.

Сходы для старшых II і III курсаў а таксама размеркаваньне па групах і аддзяленьнях паступаючых адбудзецца ў памяшканьні КУБ (пак. № 25 на Унівэрсытэцкай вул., 27) у наступныя дні:

Сход II курсаў усіх аддзяленьняў адбудзецца 8 верасьня, а $6^1/_2$ гадзіне, сход III курсу адбудзецца 9 верасьня а $9^1/_2$ гадзін увечары. Паступаючыя на парт. аддз. т-шы, якія ў сваіх анкетах не ўказалі аддзяленьня, павінны зьявіцца 11 верасьня ад 6 да 10 гадзіны ўвечары, а т-шы, якія працуюць па зьменах на вытворчасьці 12-га ад 9 з паловай да 12 гадз. дня, паступаючым на пропагандысцкае і савецкае аддз. зьявіцца 12 верасьня ад 6 да 10 гадз. увечары, для зьменных рабочых зьявіцца 13 верасьня ад 9 з паловай да 12 гадз. дня

Т-шом, якія паступаюць на яўрэйскае, газэтнае адз. і комсамольскія курсы, зьявіцца 13 верасьня ад 6 да 10 гадз. ўвечары, а зьменным рабочым —14 верасьня а 9 з паловай да 12 гадз. дня

Т-шом, якія запісаліся на вайсковыя курсы партактыву, зьявіцца 11 верасьня а 6 гадз. увечары, пак. № 26 Усім партколектывам і ячэйкам КП(б)Б і ЛКСМБ, якія яшчэ не атрымалі камандыроўкі ў ВКУ, пасьпяшыць прысылаць да 14 верасьня г. г.

Менскі вячэрні Комвуз

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599